Наталля Васілевіч

# Славацкая надзея беларусаў. Браціслава — Мінск, 2006

*Abstract*

Рэцэнзія на кнігу “Славацкая надзея: досвед дэмакратычных трансфармацый”. Разглядаюцца пытанне актуальнасці для Беларусі славацкага досведу дэмакратычных трансфармацый, асобныя артыкулы аб генеалогіі славацкай ідэнтычнасці, гісторыі Славакіі, а таксама пераходзе краіны ў 1998 г. да дэмакратыі.

Ключавыя словы: Славакія, Беларусь, дэмакратычныя трансфармацыі, Словакия, славакі, ідэнтычнасць славакаў, Чэхаславакія, OK’98, дэмакратызацыя, дэмакратычныя трансфармацыі.

**Славацкая надзея: досвед дэмакратычных трансфармацый** / Пер. са славацкай. Браціслава — Мінск: ООО «Невский простор», С.-Пецярбург, 2006. 328 с.

Уваход Славакіі ў абшар беларускай рэчаіснасці адбыўся ў 1998 г. і звязаны з дэмакратычнымі трансфармацыямі ў гэтай краіне пасля перамогі апазіцыйных прадэмакратычных сіл на парламенцкіх выбарах, якой спрыяла паспяховая мабілізацыйная кампанія «Obcianska Kampan’98» (OK’98). У выніку сфармаваны новы ўрад, што змяніў адміністрацыю аўтарытарнага кіраўніка Уладзімера Мечыяра.

Напэўна, першым у беларускай паліталогіі досвед Славакіі спрабаваў актуалізаваць Уладзімір Роўда (1999—2000), ён займаўся транзіталогіяй і разглядам мадэлей дэмакратычнага пераходу, у тым ліку і ў кантэксце дэмакратызацыі Беларусі. Спадзеючыся, што Беларусь усё ж патрапіць у трэцюю хвалю дэмакратызацыі, як гэта зрабіла большасць краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў 1990-я гады, беларускі паліттолаг карыстаўся метадалогіяй Самуэля Гантынгтана (Хантнингтон С., 2003), які прапаноўваў вылучаць у трэцяй хвалі дэмакратызацыі тры формы дэмакратычнага пераходу: трансфармацыю (transformation), калі пераход да дэмакратыі адбываецца шляхам рэформаў «зверху»; замяшчэнне (replacement), пры якім змена палітычнага ладу адбываецца хутка «знізу» ў момант палітычнага крызісу; прамежкавы варыянт (transplacement), калі праз перамовы паміж уладай і апазіцыяй дасягаецца дамоўленасць аб пераўтварэннях палітычнай сістэмы. Сярод гэтых формаў найбольш імаверным падавалася замяшчэнне, узорам якога выступаў «славацкі сцэнар» (гэтая ідэя актыўна прасоўвалася праз структуры грамадзянскае супольнасці).

1999 год — своеасаблівы для Беларусі: рэжым перажываў крызіс легітымнасці, наперадзе былі парламенцкая (2000 г.) і прэзідэнцкая (2001 г.) кампаніі — першыя пасля ўсталявання персаналісцкай дыктатуры прэзідэнта Лукашэнкі ў 1996 г. Тады здавалася, што рэжым не пераадолее крызісу, а апазіцыя толькі чакае нагоды, каб шляхам мабілізацыі грамадства дасягнуць зменаў. Аднак на парламенцкіх выбарах 2000 года апазіцыя абрала тактыку байкоту, адваротную мабілізацыі. І пра славацкі досвед загаварылі ўжо ў сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі: «Ці магчымыя ў Беларусі stunning elections?» (Роўда У., 2001), «Ці магчымы беларускі OK’2001?» (Роўда У., 2001), праводзіліся паралелі паміж рэжымамі Лукашэнкі і Мечыяра, палітычнымі сістэмамі Беларусі і Славакіі. Аднак усё скончылася адно рэфлексаваннямі на тэму «Чаму ў Беларусі не адбыліся stunning elections?» (Роўда У., 2001). Вынікі выбараў былі досыць прадказальнымі, «stunning» (ашаламляльнымі) яны сталі толькі для дэмакратычных актывістаў. Пацiху славацкі досвед быў выцеснены на другі план больш «раскручанымі» і

яркімі сербскімі падзеямі 2000 года (Сіліцкі В., 2003). «Сербскі сцэнар», як падаецца, зрабіў найбольшы ўплыў на кампанію 2001 года. Але падзеі не развіваліся паводле вызначанае мадэлі, бо ў Беларусі рэжым не толькі не пахіснуўся, але і канчаткова ўмацаваўся ў той час, як апазіцыя была надзвычай аслабленая, што прывяло да поўнай паразы і «грузінскага» сцэнару на парламенцкіх выбарах у 2004 годзе, і «ўкраінскага» — «аранжавай» рэвалюцыі — на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года. Урэшце, даследнікі альбо сцвярджалі, што Беларусь не трапляе ў трэцюю хвалю дэмакратызацыі і знаходзіцца ў яе адкаце ці трэцяя хваля ўжо скончылася, альбо абвяшчалі ўслед за Томасам Карозэрсам (Карозэрс Т., 2004) «канец парадыгмы транзіту» наогул (Транзіталогія..., 2004).

Тым не менш, славацкі досвед можа натхняць. І выхад кнігі «Славацкая надзея: досвед дэмакратычных трансфармацый» гэта пацвярджае. (Трэба заўважыць, што летась выйшла аналагічная кніга «Трансфармацыя — чэскі досвед» (Трансфармацыя..., 2005). «Славацкая надзея...» была выдадзена на беларускай мове Інстытутам грамадскіх пытанняў пры дапамозе Таварыства сяброў Славакіі. Ва ўводзінах старшыня таварыства Павал Дэмеш адзначае, што «прыйшоў час падзяліцца нашым досведам і з іншымі», кніга мае быць «крыніцай натхнення і адвагі». Як піша ў рэцэнзіі рэдактар беларускага выдання Алесь Анціпенка, «ужо на першых старонках чытач будзе вымушаны канстатаваць: паўставанне сучаснай палітычнай нацыі ды культурніцкай ідэнтычнасці славакаў надзвычай добра карэлюецца з гэткімі ж працэсамі і нашай гісторыі» (Анціпенка А., 2006).

Сапраўды, чытаючы першую частку кнігі «Чыннік гісторыі і славацкая незалежнасць», нельга не заўважыць, наколькі праблематызацыя «славацкага пытання» і спосабы яго развязання падобныя да «беларускага пытання» напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя, наколькі падобная сітуацыя, у якой апынуліся славакі «з братамі чэхамі» і беларусы «з братняю Руссю». Адзін з канцэптуальных вобразаў, што ўводзіць кніга, — вобраз ценю — «ценю венгерскага і нямецкага» ў артыкуле ***Рудольфа Хмела «Славацкае пытанне ў XX ст.»***. Аўтар разглядае гістарычныя ўмовы паўставання славацкае нацыі, якія ўспрымае як перманентную нацыянальна-вызваленчую барацьбу. У артыкуле апісваюцца працэс фармавання славацкай дзяржаўнасці і розныя мадэлі развязання «славацкага пытання», пасля таго як, паводле словаў, выказаных у 1918 г. Андрэем Глінкам, «тысячагадовы шлюб з венграмі разладзіўся». На першае месца выйшаў *чэхаславізм*, паводле якога чэхі і славакі з'яўляюцца адзіным народам і паміж імі няма істотнай розніцы. Чэхаславізму супрацьстаяў рэгіяналізм, што прызнаваў неабходную еднасць «адзінага чэхаславацкага народу», але сцвярджаў прынцып роўнасці Славакіі і Чэхіі, а гэта значыць — неабходнасць адміністрацыйнага самакіравання Славакіі ў адзіным дзяржаўным арганізме. У сваю чаргу, аўтанамізм, звязаны з імем лідэра Нацыянальнай партыі — каталіцкага святара Андрэя Глінкі — і з дэвізам «Каб славакі пачуваліся ў Славакіі дома», дэкляраваў палітычнае самавызначэнне славакаў у межах федэрацыі. Разнастайнасць поглядаў на будучыню Славакіі дапаўнялася камуністычнай мадэллю, што зводзіла «славацкае пытанне» да класавага.

У артыкуле ***«У паўценю двух таталітарных сістэм (замірэнне з мінуўшчынай)» Юрая Маруш'як*** разглядае акалічнасці існавання самастойнай славацкай дзяржавы пад нямецкай акупацыяй. Даследнік кажа пра «люстрацыйную гісторыю», пра неабходнасць катарсісу — рэфлексіі віны, якую славакі маюць праз удзел у масавым знішчэнні габрэяў у часе нямецкай акупацыі і праз супрацоўніцтва з фашыстамі, а таксама пра неабходнасць замірэння з камуністычным мінулым.

У артыкуле ***Ляаша Грэндаля «Сярэдняя Еўропа і яе прывіды»,*** напісаным яшчэ ў 1996 г., ставіцца праблема стасункаў славацкай ідэнтычнасці і Сярэдняй Еўропы на павучальным прыкладзе «сям'і Шмітаў з Кошыцаў» — тыповай гісторыі тыповых абывацеляў, падобнай да «Тутэйшых» Янкі Купалы і «Кароткай гісторыі Беларусі» Шалкевіча. Пра першае пакаленне Л. Грэдаль адзначае: «Шміты — сярэднееўрапейцы да мозга касцей. За сваё доўгае жыццё яны двойчы былі венгерскімі і двойчы чэхаславацкімі грамадзянамі, каб у рэшце рэшт памерці грамадзянамі Славацкай Рэспублікі». Другое пакаленне, дзеці Шмітаў, ужо больш не былі Шмітамі, бо адзін з іх стаў славакам з прозвішчам Кавальскі, другі — венграм з прозвішчам Ковачпатак, абодва былі заклятымі ворагамі і памерлі заўчасна. Трэцяе пакаленне, дзеці двух братоў, упершыню сустрэўшыся на пахаванні дзядулі, размаўлялі праз перакладчыка, бо не ведалі мо-

ваў адно аднаго, і пры гэтым сароmeліся сваёй сярэднееўрапейскасці.

Перажыванне мінулага і яго пераадоленне (месцамі прыўлашчванне), тварэнне славацкай гісторыі як славацкай будучыні, а таксама акт вызвалення як здабыццё незалежнасці і свайго месца («мы не знаходзім сабе месца» (тамсама: 81)) з'яўляецца цэнтральнай тэмаю «гістарычнага» зрэзу кнігі. Праблема страты і набыцця ідэнтычнасці рэканструюе прастору вакол і ўнутры Славакіі, а галоўнае — прастору для Славакіі.

У артыкуле ***«Традыцыі славацкай палітыкі» Мілан Земка*** робіць агляд палітычных рэжымаў, якія існавалі ў Славакіі на працягу дваццатага стагоддзя: гэта і першая чэхаславацкая дзяржава (1918—1938), і Ваенная Славацкая Рэспубліка (1939—1945), якую аўтар называе «чорнай дыктатурай», другая Чэхаславацкая Рэспубліка (1945—1948) і, нарэшце, «чырвоная дыктатура» (1948—1989). Паля разглядаюцца праблемы пабудовы дэмакратычнай Чэха-Славацкай Рэспублкі, якія скончыліся ў 1993 г. утварэннем незалежнай Славакіі. Іншы артыкул — ***«Фармаванне палітычных сістэм: знешнія ўплывы і ўнутраныя фактары» (Любамір Ліптак)*** — таксама закранае пытанне эвалюцыі палітычнага рэжыму, але ўжо праз аналіз не палітычнай традыцыі, а структурных змен, што адбыліся ў славацкім грамадстве цягам XX стагоддзя і спрыялі пераходу ад адной формы аўтарытарнага кіравання да іншай (разбурэнне прыватнай уласнасці ў міжваенны перыяд, разбурэнне сістэмы парламенцкай дэмакратыі ў ваенны перыяд, разбурэнне структур грамадзянскай супольнасці ў пасляваенны перыяд). У сваіх тэкстах аўтары Мілан Земка і Любамір Ліптак робяць спробы ўвесці інстытуцыйнае вымярэнне ў гістарычны кантэкст і прааналізаваць трансфармацыі палітычных рэжымаў Славакіі на працягу дваццатага стагоддзя, эвалюцыю розных элементаў палітычных сістэм: эканомікі, палітыкі, грамадзянскай супольнасці.

Усе пералічаныя матэрыялы задаюць шырокі кантэкст аналізу сучаснасці — паўставання і падзення рэжыму Мечыяра, барацьба з якім сталася, паводле меркавання ***Уладзімір Крыва*** ў артыкуле ***«Падзелы і расколы ў славацкім грамадстве»,*** «цэнтральным палітычным канфліктам, які дамінаваў у славацкім грамадстве цягам амаль усіх 1990-х гг.».

Нядзіўна, што азначаны канфлікт стаў цэнтральным для ўсяе кнігі: «Што гэта за рэжым?», «Якія былі яго падмуркі?». А галоўнае — «Як у славакаў атрымалася яго пераадолець?». Ці, запытваецца ***Соня Самалан*** у артыкуле ***«Наш шлях да стандартнай дэмакратыі»,*** «як гэта здарылася і якія фактары былі вырашальнымі для ўваходжання Славакіі ў групу кансалідаваных дэмакратый?». Яна спрабуе вызначыць ролю «славацкай надзеі» для беларусаў, фармулюючы пытанне «А што гісторыя дэмакратызацыі Славакіі можа даць Беларусі?». Адказ вяртае нас да парадыгмы транзіталогіі: «Транзітолагі паспрыялі... рэдукцыі песімізму... заразілі і акадэмікаў, і шараговых, але актыўных грамадзян «апантанасцю надзеяй». Менавіта надзея і прыклад, які кніга спрабуе даць беларускаму чытачу, у большай ступені, чым «структурныя перадумовы», мусяць «паспрыяць поспеху дэмакратызацыі».

Дзякуючы «своечасовым стратэгічным рашэнням палітычных актараў» і нягледзячы на «не вельмі спрыяльныя структурныя ўмовы», сярод якіх вызначаецца неспрыяльная грамадская думка, «трансфармацыя адбылася». І славацкія аўтары па кроку раскрываюць ролю палітычных суб'ектаў: ***«Палітычныя партыі — акторы дэмакратызацыі і сацыяльных рэформаў» (Грыгорый Мясежнікаў), «СМІ: новае аблічча» (Міраслаў Колар)***. Але найбольшая ўвага надаецца недзяржаўным арганізацыям, якім ***Марцін Бутара і Барыс Стрэчанскі*** прысвяцілі тэкст ***«Роля грамадзянскай супольнасці і няўрадавых арганізацый у дэмакратычных пераменах»***. Аналізу грамадскай свядомасці, у «канфрантацыі» з якой адбываліся змены, прысвечаны артыкул ***Зора Бутарава «Посткамуністычная ментальнасць супраць выклікаў мадэрнізацыі»***.

«Сучасная Славакія, сябра Еўрапейскага Саюзу і НАТО, — гэта іншая краіна, чым Славакія ў 1994—1998 гг.». Краіна значна трансфармавалася палітычна і эканамічна, стаўшы на шлях умацавання дэмакратычных інстытуцый (гэтаму аспекту прысвечаныя артыкулы ***Яўгена Южыца «Эканамічныя трансфармацыі»*** і ***Антона Марцінчына «Прыватызацыя і прамыя замежныя інвестыцыі»)***. Паводле словаў журналіста Івана Штулайтэра, Славакія апынулася «знутры, а не на арбіце дэмакратычнага свету» і, як сцвярджае Уладзімір Більчык, «у якасці сябра ЕС Славакія ўжо вызначылася наконт кірунку свайго палітычнага развіцця».

Так, цяперашняя Славакія — гэта іншая краіна, чым Славакія 1994—1998 гадоў: і ў кантэксце «досведу», і ў кантэксце «надзеі». Фактычна прадстаўленая кніга з'яўляецца якасным, у тым ліку і з акадэмічнага гледзішча, дапаможнікам, які дазваляе зразумець логіку развіцця і асэнсавання эвалюцыі гэтае краіны, а таксама ўтрымлівае шмат карысных эмпірычных звестак. Кнігу цікава чытаць, нават калі пакінуць па-за дужкамі праблему «надзеі».

Літаратура

1. Анціпенка А. Досвед дзеля будучыні // http://www.nmnby.org/pub//0610//17j.html.
2. Карозэрс Т. Канец парадыгмы транзіту // Палітычная сфера. 2004. № 3.
3. Роўда У. Грамадзянская мабілізацыя. Славацкі досвед пераходу да дэмакратыі // Наша Ніва. 14.05.2001. № 20 (229).
4. Роўда У. Ці магчымыя ў Беларусі stunning elections? // Наша Ніва. 11—18.12.2000. № 50 (207).
5. Роўда У. Чаму ў Беларусі не адбыліся stunning elections? // Наша Ніва. 15.10.2001. № 42 (251).
6. Сіліцкі В. Адкладзеная свабода: посткамуністычны аўтарытарызм у Сербіі і Беларусі // Arche. Пачатак. 2003. №№ 3—6.
7. Транзіталогія: праект і дысцыпліна: Размова з расійскім палітолагам Уладзімерам Гельманам // Палітычная сфера. 2004. № 3.
8. Трансфармацыя — чэскі досьвед. / Пад рэд. Любаша Вэсэлы. Прага, 2005.
9. Хантнингтон С. Третья волна: демократизация в конце XX века. Москва, 2003.